# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі КАРП Алены Аляксандраўны
“БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ ХХ СТАГОДДЗЯ: ЭСТЭТЫЧНЫ ДЫСКУРС”
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

Аўтарэферат дысертацыі Алены Аляксандраўны Карп належным чынам раскрывае змест і сутнасць яе навуковага даследавання, якое вылучаецца несумненнай актуальнасцю, навізной і адпавядае заяўленай спецыяльнасці. У свой час грунтоўнымі даследаваннямі стану і спецыфікі беларускай літаратурнай крытыкі былі працы Міхася Іосіфавіча Мушынскага, якія паставілі на новы ўзровень айчыннае літаратуразнаўства. У далейшым, як справядліва заўважыла дысертант, крытыка першай трэці ХХ ст. не выступала ў якасці самастойнага аб’екта даследавання, за выключэннем некалькіх манаграфій (К.Мароз і Т.Вабішчэвіч), якім дысертант надае належную ўвагу. Аднак сучаснасць патрабуе актуалізацыі новых сістэмных, комплексных падыходаў у асэнсаванні такога важнага складніку літаратурнага працэсу першай трэці ХХ ст., як літаратурная крытыка. Дысертацыя А.А.Карп з’яўляецца менавіта такім даследаваннем, якое, грунтуючыся на дасягненнях папярэднікаў, улічваючы іх здабыткі, фарміруе новы погляд на аб’ект даследавання, робячы ключом для аналізу паняцце *эстэтычнага дыскурсу,* што дазваляе, як слушна лічыць дысертант, “улічыць, з аднаго боку, камунікатыўную прыроду крытыкі, з іншага – выяўленне ў ёй эстэтычнай думкі” (с. 1).

Функцыянаванне эстэтычнага дыскурсу ў беларускай літаратурнай крытыцы першай трэці ХХ ст. складае прадмет даследавання дадзенай дысертацыі і прадугледжвае яго шматаспектнасць, што ў далейшым канкрэтызуецца ў палажэннях, якія выносяцца на абарону, і ў самім змесце главаў і раздзелаў дысертацыі.

Структура дысертацыйнага даследавання не выклікае пярэчанняў, бачыцца слушнай, прадуманай, адпаведнай прадмету даследавання, вызначанай мэце і пастаўленым задачам. На абарону выносяцца пяць канцэптуальна абгрунтаваных палажэнняў, сутнасць якіх лагічна, аргументавана і паслядоўна раскрываецца, паводле аўтарэферата, у змесце дысертацыі. Кампазіцыйна яна складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, аналітычнага агляду літаратуры па тэме дысертацыі, трох главаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, у якім 247 пазіцый, з якіх 14 – публікацыі саіскальніка. Паводле аўтарэферата, таксама бачна, што

палажэнні дысертацыі прайшлі грунтоўную апрабацыю на шматлікіх навуковых канферэнцыях.

Што дытычыць непасрэдна асноўнага зместу дысертацыі, то тры главы глыбока і сутнасна яго раскрываюць. Пабудова іх грунтуецца на прынцыпе храналагічнай паслядоўнасці і выяўленні сэнсавызначальных аспектаў функцыянавання эстэтычнага дыскурсу ў кожным з акрэсленых перыядаў. Першая глава "*Станаўленне эстэтычнага дыскурсу ў нашаніўскі перыяд*" складаецца з трох раздзелаў, прысвечаных нашаніўскаму перыяду і творчасці такіх дзеячаў, як В.Ластоўскі, С.Палуян, М.Багдановіч, А.Луцкевіч, чые літаратурныя працы фактычна сталі падмуркам станаўлення і развіцця нацыянальнай крытыкі і літаратуразнаўства, вызначылі іх аблічча на перспектыву.

У другой главе "*Праблемы і набыткі эстэтычнага дыскурсу ў крытыцы 1920-х гг.*" аналізуецца літаратурна-крытычны матэрыял, прадстаўлены на старонках часопісаў "Полымя", "Маладняк", "Узвышша"; выяўляецца адметнасць крытыкі ў параўнанні з папярэднім перыядам; характарызуюцца новыя тэндэнцыі ў фарміраванні камунікатыўных стратэгій, у вызначэнні прыярытэтаў мастацкага і сацыяльнага, нацыянальнага і сацыяльнага ў актуальным абліччы тагачаснага літаратурнага працэсу.

Трэцяя глава пад тытулам "*Эстэтычны дыскурс у змаганні з вульгарна-сацыялагічнай крытыкай*" мае выразна дыскусійны характар, што абумоўлена самім матэрыялам, які аналізуецца. Шмат увагі ў гэтай главе нададзена пісьменніцкай крытыцы Якуба Коласа (тры раздзелы главы прысвечаны розным аспектам гэтага пытання). Прынцыповае значэнне пісьменніцкай крытыкі Я.Коласа ў 1930-я гг. аўтар дысертацыі слушна бачыць у "рэабілітацыі ім мастацкасці, вяртанні ў крытычныя тэксты эстэтычных катэгорый" (с. 13).

У заключэнні дысертант падводзіць вынікі даследавання, якія, несумненна, узбагачаюць айчыннае літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры і з'яўляюцца новым словам у разуменні літаратурнага працэсу першай трэці XX ст., а менавіта літаратурнай крытыкі з пункту гледжання станаўлення і функцыянавання ў ёй эстэтычнага дыскурсу.

Хачу выказаць адну заўвагу, якая не ўплывае на агульную высокую ацэнку работы і мае хутчэй фармальны характар. Тым не менш, на маю думку, ёсць пэўная неадпаведнасць выказвання ў фармулёўцы першага палажэння, якое выносіцца на абарону. Так, дысертант слушна піша пра актыўнасць крытыкі, пра вырашэнне ёю не толькі мастацкіх задач, але і грамадскіх, што "павышала яе аўтарытэт і было пазітыўнай з'явай" (с. 3), і з гэтым нельга не пагадзіцца. Аднак далей сцвярджаецца: "пашырэнне функцый крытыкі да

цэнзарскіх, што адбылося ў 1930-я гг., стала прычынай яе крызіснага стану" (с. 4). Гучыць крыху парадаксальна, бо, мабыць, усё ж гэта было не "*пашырэнне* функцый", а іх "*звужэнне*", калі гаворка вядзецца пра той сапраўды крызісны стан, у якім апынулася крытыка на тым адрэзку часу?

На падставе вышэй сказанага лічу, што аўтарэферат дысертацыі А.А.Карп *"Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс"* глыбока і сутнасна адлюстроўвае змест самой дысертацыі, пацвярджае належны ўзровень навуковай кампетэнцыі дысертанта, сведчыць пра высокі прафесіяналізм і пра тое, што ёю зроблены годны ўнёсак ў айчыннае літаратуразнаўства. А таму саіскальнік ***Алена Аляксандраўна Карп***, несумненна, заслугоўвае прысуджэння ёй навуковай ступені кандыдата філалагічных навук па заяўленай спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры, тэксталогія.

Дактарант
Інстытута літаратуразнаўства ім. Я. Купалы
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт І.Э. Багдановіч
15 сакавіка 2023 г.

Подпіс Багдановіч І.Э. ПАЦВЯРДЖАЮ
Старшы інспектар
па кадрах Волкава Н.В. Волкава
15.03.2023

Водгук паступіў у савет па абароне дысертацый Д 01.42.04 15.03.2023г.
Вучоны сакратар савета (Бозан А.І.)

З водгукам азнаёмлена А. Карп (Карп А. А.)
15.03.2023г.